# ОТ РЕДАКЦИИ
# АД РЭДАКЦЫІ
# EDITORIAL

На 2018 г. прыпадаюць дзве надзвычай важныя для гісторыі Беларусі юбілейныя даты. У лютым 1468 г., 550 гадоў таму, быў выдадзены Судзебнік Казіміра – першы пісьмовы кодэкс крымінальнага права Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ). А ў студзені 1588 г., 430 гадоў таму, быў зацверджаны Трэці статут ВКЛ. Судзебнік 1468 г. стаў пачаткам працэсу кадыфікацыі феадальнага права ў ВКЛ, а Статут 1588 г. стаў яго бліскучым завяршэннем. На думку выдатнага польскага гісторыка права Юліюша Бардаха, у канцы XVI ст. ВКЛ мела найлепшую ва ўсёй Цэнтральна-Усходняй Еўропе сістэму права.

Стварэнне Судзебніка 1468 г., Статутаў 1529, 1566 і 1588 гг. адлюстравала прынцыпова новыя тэндэнцыі ў развіцці прававвой тэорыі і праватворчай дзейнасці ў ВКЛ. Мясцовае беларускае і літоўскае звычаёвае права, асобныя пастановы судовых і дзяржаўных органаў замяняліся сістэматызаваным агульнадзяржаўным пісьмовым правам. Працэс яго кадыфікацыі адлюстраваў важныя змены ў сацыяльным жыцці ВКЛ XV–XVI стст.: афармленне саслоўнай структуры феадальнага грамадства, станаўленне саслоўна-прадстаўнічай манархіі, пашырэнне палітычных правоў шляхты, развіццё юрыдычнай навукі, пашырэнне культурных сувязей з Заходняй Еўропай. Ідэі гуманізму, зафіксаваныя ў шматлікіх статутных нормах, сведчаць аб глыбокім пранікненні культуры Рэнесансу ў інтэлектуальнае жыццё ВКЛ. Статуты ВКЛ ствараліся не толькі на айчыннай глебе, яны з’яўляюцца прыкладам рэцэпцыі дасягненняў заходнееўрапейскай прававой думкі. Аднак важна тое, што стваральнікі велікакняжацкіх актаў кадыфікацыі не проста пасіўна запазычвалі заходнія канцэпцыі і паняцці, а актыўна перапрацоўвалі іх з улікам мясцовых умоў і патрэб. Самі статуты, у сваю чаргу, сталі адной з крыніц кадыфікацыі права ў Польшчы і Расіі. У другой палове XVIII ст. менавіта Трэці статут ВКЛ павінен быў стаць асновай для стварэння адзінага кодэкса правоў Рэчы Паспалітай.

У працэсе кадыфікацыі велікакняжацкага права на працягу XV–XVI стст. удзельнічалі ўсё больш шырокія колы грамадства ВКЛ, перадусім шляхты. Судзебнік 1468 г. быў выдадзены каралём польскім і вялікім князем літоўскім Казімірам Ягайлавічам на агульнадзяржаўным сойме ў Вільні: *Казимир... иже мы с князми и с паны радою нашею Великого Княжства Литовскаго и со всим посполством погадавши и врядили есмо так...* Пытанне кадыфікацыі права ў XVI ст. знаходзілася ўжо ў выключнай кампетэнцыі вальнага сойма ВКЛ. Менавіта на ім фарміраваўся склад спецыяльных статутных камісій, зацвярджаліся Статуты 1529 і 1566 гг., уносіліся некаторыя змены ў іх змест. Стварэнне Статута 1588 г. стала вынікам актыўнай праватворчай дзейнасці самых шырокіх колаў беларускай і літоўскай шляхты. Яго нормы і артыкулы абмяркоўваліся не толькі на пасяджэннях адпаведных камісій ці агульнадзяржаўных соймаў ды з’ездаў, але і разглядаліся на сойміках у паветах і ваяводствах. Вынік гэтай працы, безумоўна, сведчыць аб высокім узроўні палітычнай і прававой культуры тагачаснай шляхты ВКЛ. Дастаткова згадаць, што менавіта Статут 1588 г. абвяшчаў ідэю прававой дзяржавы, якая абараняе вольнасці сваіх абывацеляў, а ўлада падпарадкоўваецца праву. У пэўнай ступені гэты акт кадыфікацыі апярэджваў свой час, бо нават перажыў дзяржаву, у якой быў створаны. Яшчэ ў другой палове XIX ст. для шляхты, якая паходзіла з зямель былога ВКЛ, Статут 1588 г. заставаўся сімвалам колішняй гістарычнай веліччы.

Асаблівую ўвагу хацелася б звярнуць на той факт, што агульнае для ўсіх зямель Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага пісьмовае права стваралася на старабеларускай мове. Гэта выразна сведчыць аб той ролі, якую яна адыгрывала як у паўсядзённым, так і ў дзелавым жыцці розных

народаў ВКЛ. І Судзебнік 1468 г., і тры Статуты ВКЛ з'яўляюцца выдатнымі помнікамі беларускай мовы XV–XVI стст. Больш за тое, Статуты 1566 і 1588 гг. замацавалі яе афіцыйны статус у дзяржаве, а гэта паказвае, наколькі на той момант старабеларуская мова была важным фактарам захавання ўласнай дзяржаўна-палітычнай ідэнтычнасці шляхты ВКЛ ва ўмовах усё больш цесных унійных сувязей з Польшчай. Немагчыма не згадаць славутыя словы Льва Сапегі, выказаныя ім у прадмове да першага выдання Статута 1588 г.: *А если которому народу встыдъ правъ своихъ не умети, поготовю намъ, которые не обчым якым языком, але своимъ власнымъ права списанные маем и кождого часу, чого намъ потреба ку отпору всякое кривды, ведати можемъ.*

Артыкулы, змешчаныя ў раздзеле, прысвечаным прававой культуры ВКЛ, датычацца даволі разнастайнай праблематыкі. У артыкуле Уладзіміра Падалінскага на прыкладзе распрацоўкі і прыняцця Трэцяга статута ВКЛ адлюстраваны складаныя ўзаемаадносіны паміж ВКЛ і Польшчай у складзе супольнай дзяржавы – Рэчы Паспалітай – у апошняй трэці XVI ст. Андрэй Радаман у грунтоўным артыкуле паказаў удзел соймікаў Навагародскага ваяводства ў сістэматызацыі велікакняжацкага права ў канцы XVI – першай трэці XVII ст. Адной з найважнейшых сфер жыцця і дзейнасці шляхты была вайна. Матэрыял Алены Дзянісавай і Юрыя Казакова паказвае арганізацыю сістэмы земскай абароны ВКЛ і яе эвалюцыю на працягу XVI ст. паводле статутных норм. Спадзяёмся, што зацікаўлены чытач знойдзе ў гэтым нумары часопіса шмат карыснай і цікавай інфармацыі па розных аспектах нашай гісторыі.